# Вызначаны ўладальнік Гран-пры конкурсу харэаграфіі «Час танцаваць»

09.04.2023 **Аўтар: Ларыса Цімошык Фота: Лізавета Голад**

Пераканаўчую перамогу ў конкурсе атрымаў узорны ансамбль танца Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, які мае вельмі творчую назву «Натхненне». І вельмі стараецца ёй адпавядаць. Таму што яго ўдзельнікі здабылі не толькі Гран-пры, але і перамогу ў некалькіх намінацыях. А ў ансамблі, якім кіруе педагог і харэограф Галіна Крапіўніцкая, займаюцца дзеці ад чатырох да 16 гадоў. Пры гэтым яны далі фору, напрыклад, вялікім і дарослым хлопцам, якія прадстаўлялі El Gato Dance Center, што развівае альтэрнатыўны кірунак у танцы (брэйк-дэнс, у прыватнасці). Удзельнікі «Натхнення» абышлі студэнтаў Універсітэта культуры і мастацтваў, якія выбралі танец у якасці будучай прафесіі. Чараўніцтва маленства, жывых эмоцый, імпэту і стараннасці, на якія здольныя апантаныя дзеці, робіць сваю справу.




У якасці галоўнага падарунка ансамбль «Натхненне» атрымае на развіццё значную суму ў памеры 200 базавых велічынь (добра, калі ў партнёрах «Беларусбанк»). Але ж як малечы радаваліся, калі на сцэну канцэртнай залы «Мінск» у фінале вынесці вялікі торт! Здаецца, смак перамогі адчулі напоўніцу, таму што яшчэ былі дыпломы і прызы (іх таксама атрымалі найлепшыя ў розных намінацыях). Але чаго вартая сама магчымасць выйсці на вялікую сталічную сцэну і атрымліваць узнагароды з рук народнага артыста Беларусі Канстанціна Кузняцова, які ўсё жыццё прысвяціў балету, і працуе ў Вялікім тэатры, альбо пачуць водгук ад Святланы Гуткоўскай, загадчыцы кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў. Ды падавалася, што малым удзельнікам конкурсу наогул трэба адно: прастора, каб патанцаваць. А калі за гэта яшчэ і хваляць...






Уся зала была запоўнена дзятвой, якую немагчыма было стрымаць, прымусіць сядзець ціха ды маўкліва. Як толькі гучала назва якога-небудзь ансамбля — адразу выбухі радасці, эмоцый, якія немагчыма было перакрыць нават вядучым з мікрафонамі. Натуральна, напружанне нагадвала пра сябе: танцавальны марафон доўжыўся цэлы дзень, да вечара стрымліваць сваю цікаўнасць было надта складана, хоць і трэба: усе ж павінны мець шанец выступіць. Усяго ў конкурсе ўзялі ўдзел больш за 800 чалавек: 40 калектываў з 15 гарадоў Беларусі. І калі дзеці з Баранавічаў ці Бабруйска ў выніку зразумелі, што рыхтаваліся і ехалі ў сталіцу нездарма, то якія тут ужо цырымоніі? Тады дыплом у намінацыі — ўсё адно, што перамога. Добра, што лямантаваць і гучна радавацца ніхто з дарослых не забараняў (калі такое бывае?)...







— Мы атрымалі шмат эстэтычнага задавальнення ад выступленняў канкурсантаў. Гэта сведчыць пра тое, што адкрыты рэспубліканскі фестываль харэаграфічнага мастацтва, які сёлета ладзіцца другі раз, набірае абароты, — сказала падчас цэрымоніі ўзнагароджання старшыня журы Святлана Гуткоўская. — Хачу адзначыць, што якасны рывок удзельнікаў вельмі заўважны, спадзяемся, што узровень будзе расці і далей. Не буду хаваць, што больш за ўсё сяброў журы прыцягнулі і ўзрадавалі нумары, у якіх раскрываецца катэгорыя прыгожага, якія культывуюць любоў да нашай краіны, якія апяваюць самыя лепшыя пачуцці, што могуць перажываць дзеці — ад шчырай падтрымкі да сяброўства. Натуральна, што спалучэнне высокага выканальніцкага майстэрства з цудоўным яднаннем музыкі і танца, а таксама цікавыя харэаграфічныя рашэнні ды ідэі яраз і выявіліся найлепшым чынам у калектыве, якому журы аднагалосна прысудзіла Гран-пры.

Сапраўды, журы вылучыла (і адлюстравала ў дыпломах) яркія нумары з нацыянальным каларытам — нават па назвах адчуваецца, што танцаваць можна толькі разумеючы, пра што гэта. Напрыклад, «Журавы ляцяць», «Слуцкія ткачыхі» ці «Беларусь» — паспрабуйце ўявіць гэтыя вобразы ў танцы. А праз харэаграфію можна распавесці безліч цікавых гісторый, нават крэатыўна ўвасобіць адметныя з’явы — ад экзатычных ліянаў да амаль філасофскай блытаніны.




ЗВЯЗДА


ЗВЯЗДА


ЗВЯЗДА

— Калі б была мая воля, кожны з калектываў-удзельнікаў сёлетняга конкурсу «Час танцаваць» паехаў бы з Гран-пры. Мне як аднаму з арганізатараў спадабалася ўсё, што я бачыў на сцэне, — падсумаваў Аляксандр Сідарэнка, дырэктар Рэспубліканскага культурна-асветніцкага цэнтра Упраўлення справамі Прэзідэнта Беларусі. — Вельмі прыемна, што за год падрыхтоўка калектываў-удзельнікаў конкурсу значна вырасла, яны даказалі, што ўсе вартыя быць пераможцамі. І насамрэч усе, хто выходзіў на гэтую сцэну, перамаглі — найперш сябе. Яны пераадолелі ўнутраны страх, сумненні і паказалі цудоўныя вынікі.

І, вядома, мамы з татамі атрымалі падставу для гонару за сваіх дзетак — калі ў кагосьці ёсць падставы для радасці, то гэта ўжо дарагога варта. А выкладчыкі танцаў атрымалі глебу для роздуму: бо мала захапіць малых, ім трэба дапамагаць развівацца, працаваць над сабой і разумець, што перамога не даецца як падарунак, яна патрабуе вялікіх высілкаў і мэтанакіраванасці. А наперадзе яшчэ столькі выклікаў, спаборніцтваў ды і проста жыцця, калі ўсе гэтыя якасці спатрэбяцца. Вядома, і любоў да танцаў ніхто не адмяняе.

